№ 28 (621)
Ліпень 2016 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

У нумары:

☞ Афіцыйна: *аб удзеле ў канферэнцыях у Віцебску* – *стар. 2*

☞ Імпрэза: *беларуская цацка* – *стар. 3*

☞ Ініцыятыва: *кавярня ў бібліятэцы* – *стар. 5*

☞ Прадаўжальнікі: *«Астраначка» з Клімавіччыны* – *стар. 6*

Аўтаклуб зноў у дарозе

14 і 15 ліпеня «песня і кніга на колах» зноў адправіліся ў дарогу: аўтаклуб сумесна з бібліёбусам выехалі ў маланаселеныя пункты Касцюковіцкага раёна. Наперадзе час працоўных адпачынкаў, таму работнікі культуры пастараліся ахапіць як мага болей вёсак.

На гэты раз маршрут праходзіў праз Дзямідавіцкі і Беладубраўскі сельсаветы. Усяго было зроблена 12 прыпынкаў. Нягледзячы на пякучае сонца, пыльную і ўхабістую дарогу артысты дабраліся да вызначанай мэты, даставілі кнігу, музыку і песню па прызначэнні.

Утульна ўладкаваўшыся ў цяньку, мясцовыя жыхары з задавальненнем слухалі і падпявалі любімыя народам песні. Вясёлыя прыпеўкі ў выкананні загадчыцы аўтаклуба Юліі Шаршнёвай настолькі заводзілі гледачоў, што многія захацелі паспаборнічаць з ёю ў майстэрстве па выкананні мясцовых прыпевак і прыгаворак. Аб адным пашкадавалі работнікі раённага цэнтра культуры – што не захапілі з сабою дыктафон. Па такое багацце фальклорнага матэрыялу неабходна абавязкова вярнуцца зноў. Тым больш, што гасцінныя жыхары ўсіх вёсак выказалі надзею на хуткую сустрэчу.

Наталля ДРОБЫШАВА, намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна

Рэха Купалаўскіх дзён

У нядзелю 10 ліпеня ў Радашковіцкім касцёле Святой Тройцы адбыўся «Купалаў фэст – 2016», якім была завершаная вялікая праграма літаратурнага свята «Купалаўскія дні», распачатая 21 чэрвеня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы з пошукаў папараць-кветкі ў купальскую ноч.

Нагадаем, што наступнае мерапрыемства адбылося 28 чэрвеня: у дзень 74-годдзя са дня смерці Песняра традыцыйна на Вайсковых могілках, дзе пахаваны яго прах, сабраліся родныя паэта, супрацоўнікі музея, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, СМІ, прыхільнікі творчасці. А ўвечары ў сталічным Архікафедральным касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі адслужылі жалобную імшу.

У дзень народзінаў Янкі Купалы 7 ліпеня каля помніка ў сталічным парку ягонага імя прайшла акцыя «Палымянае слова паэта» з ускладаннем кветак. Разам з вучнямі сталічных школаў бралі ўдзел творцы дзіцячай літаратуры Міхась Пазнякоў, Генадзь Аўласенка, Уладзімір Мазго, Ніна Галіноўская. Купалавы словы і прысвечаныя яму вершы чыталі дарослыя і дзеці, і не толькі на роднай мове. У перакладах на рускую чыталі Янку Купалу прадстаўнікі дэлегацыі музейных супрацоўнікаў з расійскага Архангельска. Майстар-клас мастацкага чытання ўрыўка з паэмы «Адвечная песня» прадэманстраваў акцёр РТБД Андрэй Новікаў. Асаблівую цікавасць сярод маленькіх чытальнікаў выклікала спаборніцтва ў разгадванні вершаваных загадак М. Пазнякова, пераможцы ад аўтара атрымалі кніжкі. На завяршэнне акцыі дзеці выправіліся ў таямнічае падарожжа па залах музея ў пошуках чароўнай кветкі. То няхай гэты дзень пакіне добры ўспамін, а зерне палымяных Купалавых словаў прарасце ў дзіцячых душах шчодрым ураджаем.

(Заканчэнне на стар. 4)

Канферэнцыі

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці запрашаюць прыняць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускі нацыянальны тэатр: традыцыі, пошук, эксперымент» (Віцебск, 18 лістапада 2016 г.).

Канферэнцыя адбудзецца на базе Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Яе мэта – абмеркаванне актуальных праблемаў творчай і арганізацыйнай дзейнасці айчыннага тэатра і яго ролі ў фармаванні гістарычнай і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Асноўныя напрамкі працы:

- Традыцыі і эксперымент на сучаснай беларускай сцэне.
- Творчая і арганізацыйная дзейнасць нацыянальных тэатраў Беларусі і іх канкурэнтаздольнасць у сучасных сацыяльна-эканамічных і культурных варунках.
- Найноўшыя плыні і тэндэнцыі ў развіцці беларускага нацыянальнага тэатра.
- Нацыянальная і замежная класіка ў сучаснай сцэнічнай інтэрпрэтацыі.
- Беларускае сцэнічнае мастацтва і яго роля ў станаўленні і развіцці нацыянальнай і гістарычнай самасвядомасці беларусаў.
- Новыя падыходы ў даследаванні беларускай тэатральнай спадчыны.
- Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа: гісторыя і сучаснасць.
- Роля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа ў фармаванні культурнага асяродка Віцебскай вобласці.

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна выслаць да 1 кастрычніка заяўку і тэксты дакладаў ці выступленняў, аформленыя ў адпаведнасці з патрабаваннямі, па электронным адрасе yurivit@mail.ru, альбо поштай: 210026, г. Віцебск, Замкавая, 2, з пазнакай «Канферэнцыя "Беларускі нацыянальны тэатр: традыцыі, пошук, эксперымент"».

Па матэрыялах навуковых працаў удзельнікаў канферэнцыі плануецца выданне тэматычнага зборніка. Аўтары артыкулаў, што ўвайшлі ў зборнік, атрымліваюць па 1 асобніку з матэрыяламі канферэнцыі (паштовыя выдаткі за кошт атрымальніка).

Удзел у канферэнцыі бясплатны. Уступныя ўзносы і ўзносы за публікацыю навуковых артыкулаў не бяруцца.

Рэгламент для ўдзелу ў канферэнцыі: даклады – да 15 хвілінаў, выступленні – да 10 хвілінаў.

Выдаткі на праезд, пражыванне, харчаванне за кошт арганізацыяў, які накіроўваюць, альбо ўдзельнікаў.

Мовы канферэнцыі: беларуская і руская.

Усю дадатковую інфармацыю можна атрымаць у каардынатараў:

Аляксандр Міхайлавіч Замкоўскі:
тэл. раб.: +375 212 62 63 97;
тэл. маб.: +375 29 710 21 12;
Юрый Генадзьевіч Іваноўскі:
тэл. раб.: +375 212 62 63 97;
тэл. маб.: +375 29 809 12 60.

II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край» (да 385-годдзя выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля)

Арганізатары канферэнцыі: Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (кафедра гісторыі Беларусі), Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

Час правядзення: 24 лістапада 2016 года, месца правядзення: Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна (г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а).

Асноўныя накірункі працы:

- Жыццё і дзейнасць Спірыдона Собаля.
- Гісторыя кнігі. Кніжныя помнікі.
- Гісторыя краязнаўства.
- Этнаграфія і фальклор.
- Крыніцы па гісторыі Падзвіння.
- Праблемы архівазнаўства і археаграфіі.
- Праблемы падрыхтоўкі і выдання краязнаўчай літаратуры.
- Гісторыя і культура Падзвіння (ад старажытнасці да сучаснасці).
- Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства.
- Музейнае краязнаўства.
- Царкоўнае краязнаўства.
- Экскурсійная справа і краязнаўства.
- Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Рабочыя мовы: беларуская, руская, украінская, польская.

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна не пазней за 15 кастрычніка 2016 г. накіраваць на электронны адрас аргкамітэта vlib@vlib.by заяўку з указаннем наступных звестак:

- прозвішча, імя, імя па бацьку;
- вучоная ступень, званне;
- месца працы, пасада;
- паштовы адрас (службовы і хатні);
- тэлефон з указаннем кода горада;
- e-mail;
- тэма даклада;
- форма ўдзелу (вочная або завочная);
- неабходнасць зборніка матэрыялаў (колькасць асобнікаў для набыцця).

Плануецца выданне зборніка. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і матэрыялаў для друку. Ахвочыя набыць друкаваны асобнік зборніка павінныя паведаміць пра гэта пры рэгістрацыі. Электронны варыянт распаўсюджваецца бясплатна.

Патрабаванні да афармлення даклада:

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) аўтара/сааўтара, горад, краіна, назва даклада.

2. Аб'ём тэксту з ілюстрацыямі і дадаткамі – да 6 старонак фармату А4, шрыфт Times New Roman, 13 кегль, палутарны міжрадковы інтэрвал, тып файла – .doc ці .rtf (Microsoft Word). Палі – 25 мм з усіх бакоў. Абзацны водступ – 1,25 см.

Патрабаванні да электронных прэзентацыяў: тып файла – ppt Microsoft Power Point.

Тэксты дакладаў неабходна даслаць у электронным варыянце ў рэдактары MS Word да 15 кастрычніка 2016 г. на адрас vlib@vlib.by.

Зборнік матэрыялаў плануецца выдаць у 2016 г. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўключэння ў зборнік.

Выдаткі на праезд, пражыванне і харчаванне – за кошт арганізацыяў, якія накіроўваюць.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у каардынатара:

Ларыса Іванаўна Рагачова, загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі: МТС: 375 33 305 10 15;
тэл.: (+375 212) 37 30 45;
e-mail: vlib@vlib.by.

На тым тыдні...

✓ **8 ліпеня** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрашаў гасцей на літаратурна-музычнае свята **«Дзе льецца Нёман срэбраводны...»** да 110-годдзя нелегальнага настаўніцкага з'езда ва ўрочышчы Прыстанька (Стаўбцоўскі раён).

9 ліпеня 1906 г. – дата, якую запомніў на ўсё жыццё не толькі Якуб Колас, але і многія яго сябры-настаўнікі. Менавіта ў гэты дзень адбыўся нелегальны настаўніцкі з'езд каля вёскі Мікалаеўшчына на беразе Нёмана. Але ў ноч з 9 на 10 ліпеня ўдзельнікі з'езда былі выкрытыя паліцыяй. Затым не адзін год вялося следства, і многім з іх не ўдалося пазбегнуць турэмнага зняволення, у тым ліку і Якубу Коласу.

Сёлета ў Прыстаньцы, як і 110 гадоў таму, сабраліся настаўнікі – ветэраны педагагічнай працы, пісьменнікі, землякі народнага паэта, якія таксама калісьці настаўнічалі, грамадскія дзеячы і шматлікія прыхільнікі таленту беларускага Песняра. У свяце ўзялі ўдзел народныя калектывы Стаўбцоўшчыны, адбылося тэатралізаванае дзейства, якое дазволіла прысутным перанесціся больш як на сто гадоў.

✓ **8 ліпеня** ў Мемарыяльным музеі-майстэрні З.І. Азгура адкрылася персанальная **выстаўка жывапісу Улада Бубена «Шкарпэтка, дальтанізм і тэорыя змовы»**. Выстаўку склалі карціны з серыяў «Socksism» і «The Hand Of», а таксама відэаінсталяцыі аўтара. Таксама ў межах выставачнага праекта прайшоў **Міжнародны фестываль актуальнай электроннай музыкі.** У ім удзельнічалі музыкі, якія займаюцца сапраўднымі эксперыментамі ў гукавым мастацтве.

✓ **8 ліпеня** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей І з'езда РСДРП» пачала працу **выстаўка «1950 –1960: адценні чырвонага»**, прысвечаная савецкаму перыяду ў гісторыі нашай краіны.

Першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ў грамадска-палітычным жыцці адзначыліся не толькі аднаўленнем і ўздымам у эканоміцы, сацыяльнай сферы, але і развіццём культурнага жыцця Савецкага Саюза і Савецкай Беларусі. На выстаўцы прадстаўленыя розныя прадметы эпохі са збораў НГМБ: адзенне, прадметы побыту, фота-, аўдыя-, тэлеапаратура, плакаты – усё тое, што ўвабрала ў сябе дух часу.

Таксама на выстаўцы можна пазнаёміцца з **праектам аршанскага мастака-графіка Паўла Сідаровіча «Свята працы»**, які распавядае пра будні працоўнага народу. Сюжэты праекта адлюстроўваюць паўсядзённае жыццё як звычайнага працаўніка, так і офіснага. У экспазіцыі прадстаўленыя працы, створаныя ў 2004 – 2015 гг.

✓ **13 ліпеня** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі ў межах праекта «Літаратурная серада» адбылася **сустрэча з паэтам Феліксам Чэчыкам**, лаўрэатам «Рускай Прэміі», аўтарам шматлікіх паэтычных кнігаў.

Ф. Чэчык нарадзіўся ў Пінску, з 1997 г. жыве ў Ізраілі. Скончыў Літаратурны інстытут імя А.М. Горкага, стажыраваўся ў інстытуце славістыкі Кёльнскага ўніверсітэта. Вершы паэта друкавалі расійскія часопісы «Волга», «Знамя», «Інтэрпоэзия», «Урал», партал textura.by.

✓ **14 ліпеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася **выстаўка Міколы Купавы «Алаіза» да 140-годдзя Алаізы Пашкевіч (Цёткі).**

Пачынальніца беларускай літаратуры А. Пашкевіч усёй сваёй творчасцю, грамадскай і асветніцкай дзейнасцю імкнулася сцвердзіць абавязак песняра і грамадзяніна – служыць нацыянальнаму, сацыяльнаму і духоўнаму адраджэнню сваёй Бацькаўшчыны. І назаўсёды засталася ў памяці народа як сімвал ахвярнасці, пакутаў і веры.

Да вобраза знакамітай паэткі не аднойчы звярталіся беларускія мастакі і скульптары Святлана Гарбунова, Рыгор Іваноў, Міхаіл Басалыга, Анатоль Волкаў і іншыя. М. Купава – сучасны беларускі мастак, які працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі, акварэлі, жывапісу. Мастак выканаў аздабленне звыш 35-і кніг і выданняў, браў удзел болей як у 90 выстаўках. У 2007 г. яго персанальная выстаўка прайшла ў Бруклінскай царкве імя Кірылы Тураўскага (ЗША), у 2010 г. мастак удзельнічаў у калектыўнай выстаўцы ў Кангрэсе ЗША ў Вашынгтоне.



На фота Наталі КУПРЭВІЧ: дырэктар бібліятэкі імя Цёткі Рэгіна Багамолава; экскурсію праводзіць Мікола Купава

Кургану Бессмяротнасці ў Полацку – 50!

Ужо больш за 70 гадоў беларусы шануюць памяць герояў і ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі нашай краіны знаходзіцца вялікая колькасць помнікаў, памятных знакаў, мемарыяльных шыльдаў, што нагадваюць пра агульную для ўсіх нас трагедыю і амытую крывёй Перамогу. Першы помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў Полацка быў устаноўлены на цэнтральнай плошчы горада ўжо праз два з паловай месяцы пасля выгнання гітлераўцаў – у верасні 1944 г.

Адным з самых значных помнікаў сучаснага горада з'яўляецца Курган Бессмяротнасці, узведзены да 22-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пад будаўніцтва была адведзеная пляцоўка ў паўднёвай частцы Полацка на левым беразе Заходняй Дзвіны, што падзяляе горад на дзве часткі. Праект помніка быў распрацаваны тагачасным галоўным архітэктарам горада Мікалаем Глазуновым. Для 10-метровага кургана прывезлі зямлю з брацкіх пахаванняў Аршанскага, Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Шумілінскага, Ушацкага раёнаў, а таксама з Брэсцкай крэпасці і могілак савецкіх воінаў на Альшанах

у Празе – усяго 2 500 кубаметраў зямлі.

Працы, у якіх прынялі ўдзел тысячы палачанаў, пачаліся з закладкі капсулы з пасланнем нашчадкам. Сёння яна знаходзіцца пад мармуровай плітой з надпісам «Под этой плитой 8 июня 1966 года при закладке Кургана Бессмертия замуровано завещание потомкам. Вскрыть в 2017 году, в дни столетия советской власти». Побач – другая пліта, на якой высечаны памятны надпіс наступнага зместу: «Благодарное Отечество будет вечно гордиться бесстрашными подвигами своих отважных сыновей и дочерей, павших в боях за независимость социалистической Родины». Каля падножжа кургана быў запалены Вечны агонь, а на вяршыні – факел – сімвал подзвігу і памяці пра тых, хто аддаў жыццё ў імя будучыні.

3 ліпеня 1966 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Кургана Бессмяротнасці. Пад мелодыю рэквіема «Вечная слава героям» Героі Савецкага Саюза Зінаіда Міхайлаўна Тусналобава-Марчанка, Віктар Іванавіч Яронька і Барыс Уладзіміравіч Гетц запалілі Вечны агонь. Урачыстасць сабрала каля 80 000 чалавек.

1 кастрычніка таго ж года каля Кургана Бессмяротнасці быў закладзены парк культуры і адпачынку імя 50-годдзя савецкай улады, да якога ад кургана вяла шырокая бетонная лесвіца. У парку, створаным на грамадскіх пачатках, былі разбітыя алеі Бессмяротнасці, Ардэнаносцаў, Памяці загінулых, Перадавікоў, Гістарычная, Школьная, Спартыўная, Годнай змены. Юбілейная алея заканчвалася пляцоўкай перад лесвіцай да кургана, на якой у 1967 г. быў адкрыты помнік «Клятва партызан» балгарскага скульптара Валянціна Валева. У 1971 г. у парку быў адкрыты Музей баявой славы (сёння – адзін з філіялаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка). Для жыхароў Полацка і Наваполацка Курган Бессмяротнасці, у першую чаргу, з'яўляецца месцам, дзе праходзяць святкаванні Дня Перамогі.

Апошнім часам, згодна з генеральным планам развіцця Полацка, з'явілася ідэя стварыць каля кургана не толькі пляцоўку для выстаўкі ваеннай тэхнікі, але і пабудаваць спартыўна-забаўляльны цэнтр, лыжа-ролерную трасу, дэкаратыўны штучны вадаём, ландшафтна-рэкрэацыйны востраў XII стагоддзя, пляцоўку з відам на Дзвіну і Сафійскі сабор, пірс з прыстанню для прагулачных кацераў, атракцыёны, танцпляцоўку і іншыя аб'екты адпачынку. Далёка не ўсе палачане падтрымліваюць рэалізацыю гэтага праекта, бо ў непасрэднай блізкасці з курганам і паркам знаходзяцца могілкі.

Вось ужо пяць дзясяткаў гадоў Курган Бессмяротнасці ўзвышаецца на беразе Дзвіны. Насупраць яго праз раку знаходзіцца Сафійскі сабор. Калі фатаграфаваць курган з адпаведнага ракурсу, здаецца, быццам ад яго да сабора пракладзеная алея, прайшоўшы па якой, можна без перашкодаў трапіць да старажытнага храма.

Славіна ГАЎРЫЛАВА,
вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
Фота аўтара

Ад «КГ» ***хочацца параіць: падысці да храма і падумаць... добра падумаць перад тым, як аб'ядноўваць мемарыяльную зону і зону адпачынку! Бо там, дзе смуткуюць, – там не танцуюць.***

Беларуская цацка

Сёння адраджаецца цікавасць да такой з'явы этнічнай культуры, як беларуская народная цацка. Яна разам з песнямі, казкамі, святамі з маленства выхоўвала густ і пачуццё прыгажосці, закладвала падмурак разумення сувязі са сваім народам, з пэўнай часткай зямлі – Бацькаўшчынай.

У Струбніцкай сельскай бібліятэцы ў рамках раённага бібліятэчнага конкурсу на лепшае мерапрыемства да Года культуры «Год культуры крочыць па краіне» адбылося свята «Беларуская цацка». Вядучыя пазнаёмілі прысутных з гісторыяй узнікнення традыцыйнай цацкі беларускага народа, якая з'яўляецца не проста забавай, а сімвалам працягу роду, залогам сямейнага шчасця.



С. Чарніцкая

Героі свята дзед Міхед і бабуля Гануля прадэманстравалі беларускія цацкі: саламяныя конікі, свістулькі з дрэва, лялькі з тканіны, саломы, дрэва і паперы, саламянага павука, дамавікоў з беларускага лёну, а таксама расказалі аб іх значэнні і выкарыстанні ў сямейных і каляндарных абрадах. Юныя чытачкі, актыўныя сяброўкі аматарскага аб'яднання «Краіна талентаў» пад песню «Жавароначкі, прыляціце» выканалі танец. Удзельнікі мерапрыемства атрымалі невялікі падарунак – выпечаныя з цеста фігуркі жаваранкаў. У рамках свята дэманстравалася выстаўка «Беларуская цацка».

Мерапрыемства атрымалася вельмі цікавым і спазнавальным. Пакуль будуць адбывацца такія сустрэчы з даўніной, нашай самабытнай культуры нічога не пагражае.

Струбніцкая сельская бібліятэка з'яўляецца філіялам Мастоўскай раённай бібліятэкі. Асаблівае месца ў яе працы займае дзейнасць аматарскага аб'яднання «Краіна талентаў», мэтай якога з'яўляецца развіццё творчых здольнасцяў дзяцей і падлеткаў. Юныя ўдзельнікі аб'яднання авалодалі тэхнікамі роспісу на шкле, бісерапляценнем, аплікацыяй з прыродных матэрыялаў і інш. Неаднаразова творы дзяцей былі прадстаўленыя на раённых творчых конкурсах і атрымоўвалі ўзнагароды.

Сняжана ЧАРНІЦКАЯ,
бібліятэкар Струбніцкай сельскай бібліятэкі,
Мастоўскі раён

Рэха Купалаўскіх дзён

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Як і памер купальскага вянка, які ўрачыста спускаюць на ваду маляўнічай сажалкі, з кожным годам шырыцца кола ўдзельнікаў Купалаўскіх святаў у Вязынцы. Сёлета да традыцыйнага фэсту паэзіі, песні і народных рамёстваў, што ладзіць Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы сумесна з СПБ і Маладзечанскім райвыканкамам, далучыліся Асацыяцыя «Прафесіяналы фларыстыкі і кветкавага бізнесу», медлабораторыя «Синэво», фэшн-фатографы з асацыяцыі «Фотамастацтва», першы канал БТ, інтэрнэт-рэсурсы і іншыя прадстаўнікі СМІ. У якасці ганаровых гасцей на свята запрасілі прадстаўнікоў пасольстваў васьмі краінаў. Да адметнасцяў свята, што адбылося 9 ліпеня, можна аднесці конкурс купальскіх вянкоў і букетаў «Купальская краса», дзіцячы фларыстычны конкурс «Купальская красачка», майстар-класы па вырабе купальскіх вянкоў у рамках кветкавага этнафестывалю, прэм'еры песень, дзіцячую школу малявання, спеўны карагод і шмат іншага. Прыемна адзначыць, што большасць гасцей завітала на свята сем'ямі.

Купальскія вянкі і букеты Вязынкі

У праграме свята кожны знайшоў занятак па душы, наталіўся паэтычнымі радкамі, узбагаціўся цікавымі звесткамі з жыцця Песняра і яго родных. Можна было патанчыць і паспяваць, нават даведацца... у экспрэс-лабараторыі «Синэво» пра склад сваёй крыві.

Апісаць усе падзеі свята проста немагчыма. У гэтую вязынскую атмасферу варта акунуцца. Гэта трэба бачыць. Таму глядзіце здымкі (болей іх змешчана на нашым сайце bfk.by). І не прапусціце наступны фэст.

У нядзелю, 10 ліпеня, пляцоўкай свята стаў касцёл у Радашковічах. Тут пад час першага сакраманту – хросту, які адбыўся 12 ліпеня 1882 г., сын Дамініка і Бянігны Луцэвічаў Янка займеў і хросную маму – ёй стала жонка гаспадара вязынскага маёнтка Станіслава Замбжыцкага Алімпія.

Другі для Івана Луцэвіча лёсавызначальны запіс, засведчаны ў пашпарце, калі яму было 33 гады, упісаны 23 студзеня 1916 г. у маскоўскім касцёле Святых Пятра і Паўла, пра сакрамант сужэнства з абранніцай Уладзіславай Станкевіч, з якой ён пазнаёміўся ў 1908 г. у Вільні ў рэдакцыі газеты «Наша Ніва».

Менавіта шлюб Янкі Купалы з Уладзіславай Станкевіч, стагоддзе якога адзначаецца сёлета, стаў галоўнай тэмай святкавання «Купалавага фэсту» ў Радашковічах, які пачаўся пад урачыстыя гукі аргана.

Радашковіцкая парафія падрыхтавала да свята выстаўку шлюбных фота сямейных параў, якія вянчаліся тут, а таксама традыцыйныя мясцовыя вясельныя пачастункі. Купалаўскі музей прапанаваў тэматычную перасоўную выстаўку «Янка Купала ў дыялогу культур» і матэрыялы пра Купалаў шлюб і яго абранніцу Уладзіславу «Ісці супольна праз ўсё жыццё». Некаторымі звесткамі з гэтай прэзентацыі мы падзелімся з нашымі чытачамі.

Уладзіслава Станкевіч нарадзілася 25 снежня 1891 г. у Вішневе Ашмянскага павета Віленскай губерні ў сям'і ляснічага Франца Станкевіча, які працаваў у Каралінаве, і настаўніцы французскай мовы Эміліі Манэ, сваячкі знакамітага мастака Клода Манэ. Уладзіслава мела добрую хатнюю адукацыю, экстэрнам скончыла гімназію ў Вільні і педагагічныя курсы ў Варшаве. У 1908 г. паехала ў Вільню, дзе да 1915 г. працавала педагогам-выхавацелькай у дзіцячых установах. Калі да горада наблізіўся фронт – апекавала дзяцей-бежанцаў.

У тым жа годзе 23 студзеня Янка Купала надрукаваў першы верш-прысвячэнне Ул. Станкавічанцы «Успомні!..». Другі верш – «Мусіць, трэба было...» – быў напісаны 19 чэрвеня, наступны – 7 жніўня – «Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея...». Пабраліся шлюбам акурат у гадавіну публікацыі першага верша-прысвячэння. 26 супольных гадоў пражылі разам у любові й павазе, захавалі сардэчную цеплыню пачуццяў да апошніх дзён.

У касцёле існуе традыцыя аднаўлення сакраманту сужэнства. У дзень святкавання стагоддзя шлюбу Яна і Уладзіславы адбылося аднаўленне сакраманту сужэнства вернікаў мясцовай парафіі Валянціна і Катажыны Шаўрукоў, якія вянчаліся ў касцёле 10 гадоў таму. А потым да алтара запрасілі шлюбныя пары з ліку прысутных на свяце. Мужам было прапанавана прачытаць сваёй жонцы верш Янкі Купалы і расказаць пра сваю першую сустрэчу з ёй. Расповеды атрымаліся вельмі цікавымі. Потым ахвочыя бралі ўдзел у віктарыне, з якой даведаліся пра малавядомыя факты з жыцця Янкі Купалы. Усе ўдзельнікі творчага задання і віктарыны атрымалі падарункі: кніжныя закладкі ад партала Catholic.by і кружэлкі з песнямі Алеся Камоцкага (іх падрыхтаваў сам выканаўца), а фіналісты – яшчэ і запрашэнні на наведванне музея, вядома ж, на дзве асобы.

Урок ад Ю. Бажок

Далей на імправізаванай сцэне – прама на касцельным ганку – адбыўся канцэрт. Першаю выступіла салістка Белдзяржфілармоніі цымбалістка Таццяна Шумакова, лаўрэат і фіналіст многіх міжнародных конкурсаў і фестываляў. Далей свае творы выканалі бард Алесь Камоцкі, лідар гурта «Рэха», мастак Андрусь Такінданг, гурт «Балцкі Субстрат», песні на словы Янкі Купалы праспяваў грэка-каталіцкі бард Арцём Сітнікаў. Юлія Бажок пад музычнае суправаджэнне дуды і барабана музыкаў Ігара Расолькі і Максіма Гінтава вучыла ахвочых беларускім народным танцам і гульням.

Завершылася свята словамі пробашча Юрыя Быкава і дабраславеннем усіх сем'яў ды супольнай малітвай за Беларусь «Магутны Божа».

Конкурс ад М. Пазнякова

Чытанне вершаў Купалы пра каханне

Наталі КУПРЭВІЧ
Фота аўтара

В. і К. Шаўрукі пад час цырымоніі

Ад рэдакцыі. ***Цешыць, што ўрачыстасці перасталі абмяжоўвацца толькі музеямі класіка нашай літаратуры ды месцам ягонага з'яўлення на свет. Цяпер жа хочацца спадзявацца, што свята перакрочыць канфесійныя рамкі. Бо ў Радашковічах на фэсце былі не толькі католікі. Спадзяемся, што прадстаўнікі духавенства розных канфесіяў знойдуць паразуменне ды супольна наладзяць чарговы «Купалаў фэст». Няхай асоба нашага Генія аб'яднае ў Радашковічах вернікаў розных канфесіяў (і не толькі хрысціянскіх, і не толькі пад час фэсту).***

Роднаму слову жыць!

У Ганцавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя В. Праскурава створаны літаратурна-краязнаўчы пакой «Ганцаўшчына літаратурная», дзе кожны наведнік можа пазнаёміцца з творчасцю літаратараў-землякоў.

На кніжных паліцах прадстаўленыя творы Аляксандра Сержпутоўскага, збіральніка народнай творчасці; Якуба Коласа, які першую частку трылогіі «На ростанях» – «У палескай глушы» прысвяціў вёсцы Люсіна, дзе ў маладыя гады настаўнічаў; Васіля Праскурава – знакамітага нарысіста, імя якога прысвоенае бібліятэцы; слынных літаратараў – Міхася Рудкоўскага, Івана Кірэйчыка, Уладзіміра Марука, Алеся Каско, Алеся Кажадуба, Віктара Гардзея, маладых творцаў.

Захаваныя рукапісы, кніжныя і часопісныя выданні, фотаздымкі, партрэты літаратараў і іх асабістыя рэчы шмат аб чым раскажуць таму, хто цікавіцца літаратурнай спадчынай нашага краю. І вядома ж – дзе, як не тут арганізоўваць літаратурныя, юбілейныя і святочныя вечарыны, прэзентацыі кніг? Для школьнікаў тут праходзяць экскурсіі. Старэйшае пакаленне збіраецца на сустрэчы, дзе гучаць успаміны пра мінулае, родныя песні, матчына слова.

Гэты год багаты на юбілейныя даты нашых пісьменнікаў. У красавіку адзначылі юбілей М. Рудкоўскага, у жніўні пройдуць Праскураўскія чытанні, прысвечаныя 90-годдзю творцы, і ўшанаванне пісьменніка В. Гардзея на яго радзіме ў вёсцы Малыя Круговічы. Сёлета ў снежні будзем віншаваць з юбілеем А. Каско. Частка мерапрыемстваў будзе праходзіць у літаратурна-краязнаўчым пакоі «Ганцаўшчына літаратурная».

Хацелася б, каб кола прыхільнікаў творчасці літаратараў-землякоў пашыралася штогод, але ў сённяшні век новых тэхналогіяў прывабіць чытача зайсці лішні раз у бібліятэку не заўсёды атрымліваецца. Работнікам аддзела бібліятэчнага маркетынгу захацелася вынайсці нешта незвычайнае ў сценах бібліятэкі, каб чытач не толькі завітаў сюды, але і не захацеў выходзіць адсюль. І трэба адзначыць, што ганцавіцкім бібліятэкарам гэта ўдалося. Пад час святкавання Дня Незалежнасці бібліятэка прапанавала сваім чытачам пазнаёміцца з рэтра-выставай «Самая старая рэч у маёй сям'і», створанай з іх дапамогай. Экспанаты, прадстаўленыя на выставе, – гэта рэчы, якія беражліва захоўваюцца ў сем'ях гадамі. Тут можна ўбачыць сшытак па правапісе вучаніцы 1 класа 1947 года і партманет, з якім франтавік прайшоў усю вайну, Біблію, надрукаваную на пачатку XX стагоддзя, і нават цэлую бутэльку з-пад шампанскага дзесяцікапеечных манетаў савецкага перыяду.

Пазнаёміўшыся з нетрадыцыйнай выставай, чытачу прапаноўваюць завітаць у літаратурна-краязнаўчы пакой, дзе арганізаванае бібліякафэ «Адпачываем з кнігай». Прывабная бібліятэкар-«афіцыянтка» прапаноўвае азнаёміцца з незвычайным меню і выбраць што-небудзь на свой густ. Можна заказаць чытанне любімай кнігі літаратара-земляка, паслухаць беларускую паэзію ці песню на матчынай мове. Магчыма, камусьці захочацца праглядзець дакументальны фільм, які апавядае пра жыццё і творчасць пісьменнікаў Ганцаўшчыны, – калі ласка! Шмат завітала ў гэты дзень маладых сям'яў з дзеткамі. Для іх у меню прадугледжанае чытанне дзіцячых твораў, напісаных землякамі. Чытанні, спеўкі пад баян, прагляды фільмаў – усё гэта праходзіла за кубачкам духмянай гарбаты. Задаволеным застаўся чытач добра праведзеным вольным часам, задаволенымі засталіся і мы, бібліятэкары. Аказалася, на здзіўленне наведнікаў літаратурнага кафэ, што і ў свята можна адпачываць разам з кнігай. У невялічкім пакоі, прысвечаным творчасці літаратараў-землякоў, прайшло сапраўднае свята роднага слова, дзе ў нязмушанай абстаноўцы лілася цікая гамонка на матчынай мове, асалодай на душу кралася мелодыі беларускіх песень і гучала слова землякоў. Гучала, як пісаў Уладзімір Караткевіч, «наша родная мова... гнуткая, пявучая, адвечна новая, без якой нельга ўявіць сабе свайго жыцця, як без хлеба, як без паветра».

Пакуль будуць існаваць у бібліятэках такія, няхай і невялічкія, асяродкі культуры, дзе паважаюць і ашчадна захоўваюць творчасць літаратараў-землякоў, роднаму слову жыць!

Таццяна МАЛЯЎКА,
загадчык аддзела
бібліятэчнага маркетынгу
Ганцавіцкай цэнтральнай
раённай бібліятэкі
імя В. Праскурава

Паэт сышоў, а вершы засталіся

21 чэрвеня на базе Ушанскай інтэграванай бібліятэкі сумесна з Бярэзінскай цэнтральнай бібліятэкай была зладжаная вечарына «Бярэзінскі васілёк на літаратурнай ніве», прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння нашага знакамітага пісьменніка Івана Маркевіча.

Іван Мікалаевіч нарадзіўся 15 чэрвеня 1936 г. у вёсцы Восава Бярэзінскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1963 г. хлопец пачаў супрацоўнічаць з чэрвеньскай газетай «Уперад», а калі ў 1965 г. быў адноўлены Бярэзінскі раён – з раённай газетай «Сцяг Леніна». Ён працаваў ў раёнцы і адначасова вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1973 г. І. Маркевіч ужо супрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва». У тым жа годзе выйшаў і першы зборнік паэта «Камандзіроўка».

Пры жыцці Івана Мікалаевіча не атрымалася выдаць усе яго рукапісныя творы, і родзічы перадалі пісьменніцкі архіў у Бярэзінскую цэнтральную бібліятэку. Да 75-годдзя з дня нараджэння аўтара ў бібліятэцы быў выдадзены зборнік вершаў «Мой адрас», а сёлета мы дапрацавалі рукапісныя матэрыялы, і атрымаўся зборнік вершаў «Вечны след», які хутка з'явіцца ў кожнай бібліятэцы раёна.

Пад час вечарыны «Бярэзінскі васілёк на літаратурнай ніве» гучалі вершы І. Маркевіча ў выкананні вучняў Ушанскай сярэдняй школы Валерыі Хадаронак, Кірыла Малькевіча і Аляксандры Цюхай. Дзіцячы вакальны гурт сельскага дома культуры выконваў беларускія песні.

На сустрэчу завітала жонка паэта Марыя Мікалаеўна з унукамі, пляменнікамі і сябрамі, а таксама калега І. Маркевіча – пісьменнік Яўген Хвалей. Жонка Івана Мікалаевіча падзялілася ўспамінамі пра жыццё мужа, распавяла, як прыходзіла да яго натхненне. Яўген Іванавіч распавядаў цікавыя гісторыі і не раз падкрэсліў, што вобраз паэта ў яго асацыюецца з васільком. Пасля прэзентацыі зборнік быў уручаны родным І. Маркевіча.

Зборы на рыбалку

Вершы бярэзінскага паэта прасякнутыя ўспамінамі з дзяцінства і юнацтва, смуткам ад страты маці, каханнем, захапленнем родным краем:

Родныя мясціны –
далягляд шырокі,
Цішыня прастору,
светлых дум размах.
Дарагі і любы,
край мой сінявокі,
Весела блукаць
мне па тваіх палях.

Кацярына ЛЯСУН,
бібліятэкар
аддзела абслугоўвання
Бярэзінскай ЦБ
Фота аўтара

Выступае жонка І. Маркевіча Марыя Мікалаеўна

«Астраначка»
на беразе ракі Асцёр

Ёсць на Клімавіччыне прыгожая рэчка Асцёр. Спяваюць на яе берагах дарослыя і зусім маладыя самадзейныя артысты аб каханні і прыгожым беларускім краі. Чуваць песні, якія гучалі яшчэ шмат гадоў таму. З замілаваннем глядзяць вяскоўцы на сваіх спевакоў і танцораў, бо гэта пяюць іх суседзі і родзічы. Яны перадаюць прыгажосць народных песень адно аднаму, а гэта і ёсць народная спадчына.

Сваю назву дзіцячы ўзорны фальклорны калектыў «Астраначка» ўзяў ад ракі Асцёр, што цячэ ў вёсцы Стары Дзедзін. Вёска заўсёды славілася прыгожымі галасамі жанчынаў і іх песнямі, якія і цяпер выдатна гучаць у выкананні народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля Старадзедзінскага сельскага клуба «Астранка». Стварыла калектыў Галіна Брыкава, а цяпер ім кіруе Святлана Грышукевіч.

Творчасць «Астраначкі» пачалася з таго, што яе ўдзельнікі слухалі песні сваіх бабуляў і разам з імі спявалі пад час народных святаў. Цяпер гэта суполка аднадумцаў, зачараваных фальклорам і ўлюбёных у яго. Калектыў быў створаны ў 2004-м, а званне ўзорнага атрымаў у 2010 годзе.

– Песня народная, старадаўняя расказвае аб жыцці і сама часцінка жыцця, – так вучыць удзельнікаў ансамбля «Астраначка» старэйшая спявачка народнага калектыву «Астранка» – яго салістка і збіральніца народных песень Зінаіда Асіпенка.

У тым, як любяць у вёсцы народныя мелодыі і танцы, можна пераканацца, пабыўшы на сумесных выступленнях двух ансамбляў. Асноўным для ўдзельнікаў «Астраначкі» з'яўляецца выкананне каляндарна-абрадавых, сямейна-побытавых, лірычных песень і танцаў, якім яны навучыліся ад сваіх бабуляў, у тым ліку ад Марыі Куцікавай і Еўдакіі Карпечанкі. Танцы, якія выконвалі на вечарынках і народных святах, ансамбль пераняў ад Вольгі Гудковай, З. Асіпенкі, Марыі Анголавай, Івана Семчанкі, Г. Брыкавай і Таццяны Скоцкай.

Падлеткі – удзельнікі гурта «Астраначка» – з вялікім задавальненнем апранаюць народныя касцюмы. Яны шчыра цікавяцца народнай спадчынай, святамі і абрадамі, дзе можна паказаць сябе ў розных ролях і вобразах. Удзельнікі ансамбля беражліва і клапатліва ставяцца да спадчыны, атрыманай ад старэйшых. Папаўняецца рэпертуар ансамбля ў асноўным песнямі і танцамі, якія выконвае старэйшы гурт «Астранка».

Хочацца пайменна пералічыць удзельнікаў калектыву: гэта сёстры Наталля, Марыя, Дар'я і Кацярына Кірпічэнка, Таццяна Краўцова, Дзмітрый Сцелькін, Даніла Грышукевіч, Юлія Ганжажарава і Святлана Касперава. А раней спявалі Святлана Скоцкая, Юля Селядцава, Марыя Кургузава, Дзмітрый Баранаў, Ю. Касенюк і Дзяніс Пецін. Цяпер яны ўжо дарослыя і працуюць (напрыклад, Юля Касенюк цяпер дырэктар Мілаславіцкага СДК), а нехта яшчэ вучыцца ў вышэйшых навучальных установах.

«Астраначка» актыўна ўдзельнічае ў раённых і абласных мерапрыемствах. Акрамя выступленняў, прысвечаных урачыстым датам і святам, калектыў прымаў удзел у рэспубліканскім свяце працаўнікоў сельскай гаспадаркі «Дажынкі-2006», якое праходзіла ў Бабруйску. Бліскучымі былі перамогі ў 2006 і 2008 гадах на Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня». У 2007 годзе гурт выступіў на свяце Беларускага пісьменства ў Шклове, налета разам з дарослымі ўдзельнічаў у свяце да 300-годдзя бітвы пад вёскай Лясная, а таксама ў аглядзе-конкурсе фальклорных танцаў у Магілёве.

Летась калектыў прыняў удзел у IV Міжнародным форуме «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства», у абласным фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2015», а на рэгіянальным свяце фальклорных калектываў і сольных выканаўцаў «Са стагодзя ў стагодзе» атрымаў дыплом III ступені.

Па выніках мінулага года сярод калектываў мастацкай самадзейнасці, у тым ліку тых, якія маюць званні ўзорнага і народнага, узорны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Астраначка» Старадзедзінскага сельскага клуба прызнаны лепшым.

Дар'я ЭВЕРС,
дырэктар Клімавіцкага краязнаўчага музея

Спачатку гэта былі камяні ў нашым двары ў вёсцы Падсадскія на Уздзеншчыне, дзе прайшло маё дзяцінства. Яны і цяпер там. Гэта ж вам не жартачкі, іх так проста не падымеш, не перанясеш у іншае месца. Адкуль яны? Цяпер мне ўжо ніхто не адкажа. І дзядуля, і бабуля даўно памерлі... А камяні ляжаць уздоўж плота на тых жа месцах, што і сорак тры гады таму. Усяго іх пяць. Над аднымі расце бэз з белымі кветкамі, што чаруюць сваім хараством позняй вясною. Два іншыя – пад клёнамі, з якіх дзядуля спускаў сок. Яшчэ адзін – пад бярозай, якую давялося спілаваць з-за старасці...

Мае камяні

Каля Савасцянавага броду, дзе мы любілі купацца летам, таксама быў вялізны камень. Гэта быў своеасаблівы арт-аб'ект: седзячы на ім, мы, дзеці, фатаграфаваліся.

Можна сказаць, што мяне цягнула да камянёў. Жывучы ўжо ў Кухцічах, я каталася на веласіпедзе і аднойчы ўбачыла незвычайнае відовішча. За старым аэрадромам «Маяк», які даўно не дзейнічае, вакол калгаснага поля і ў лесе, што мае назву Кніжкі, было шмат вялікіх камянёў. На многія з іх можна было стаць ці нават легчы – вось на якія цуды багатая прырода Беларусі!

Пазней я часта чула назву вёскі Камяное. Неяк раз, лістападаўскімі прыцемкамі, знаёмы механізатар правёў мяне да нехарактэрных для нашай мясцовасці двух валуноў, амаль што скалаў, якія высіліся сярод поля. Потым я паехала на тое месца днём, каб сфатаграфаваць іх.

Ці былі яны сведкамі ледніковага перыяду? Бачна, што гэта сумесь пясчаніку з гранітам, ёсць украпіны кварцыту. У раённай кнізе «Памяць» змешчаная інфармацыя пра валуны ў Камяным. У інтэрнэце прыводзіцца спіс мясцінаў у Беларусі, дзе можна пабачыць камяні, падобныя да ўздзенскіх. Нашыя валуны, дарэчы, большыя, і акрамя двух вялікіх побач ёсць яшчэ і меншыя камяні.

Той, хто наведваў гэты куточак Уздзеншчыны, напэўна, заўважыў, што адзін камень, пляскаты, – ляжыць, а другі – стаіць, ён быццам накіраваны ўгору. Побач з імі яшчэ адзін камень меншага памеру, далей ёсць некалькі камянёў яшчэ меншых. Некаторыя з іх быццам выглядваюць з-пад зямлі.

Для нашых мясцінаў такія дзівосы не ўласцівыя, таму і ўзнікаюць пытанні. Адкуль гэтыя камяні? Выраслі? Ці прыкаціліся (як згадваецца ў некаторых крыніцах) нібыта са Скандынавіі? Менавіта гэта ўявіць цяжка, валуны надта вялікія па памерах. І чаму тады толькі ў гэтым месцы такія камяні? Колькі стагоддзяў ляжаць яны каля вёскі? І ці быў гэта, як распавядалі вяскоўцы, адзін камень, які раскалола маланка?

Мы можам скласці легенды, стварыць гіпотэзы. Але адказ ведаюць, напэўна, толькі самі валуны, што ляжаць у полі за вёскай Камяное.

Ліяна ТАПАДЗЭ

«Сонейка, зайграй нам...»

Уздоўж

1. «Для ўсіх ...-кветка ўзыходзіць» («Курган», Янка Купала). **5.** Кавалак тканіны, які сцелюць на ложак. **12.** Месца перакрыжавання дарог; на Купалле туды прыходзілі дзяўчаты, каб даведацца пра свой лёс. **14.** «Клічуць русалкі ў смугу і ..., // Вабяць у цёмныя сховы» («Русалкі», В. Гардзей). **15.** «Зарніцы купальскага ..., // Дзе папараць-кветка цвіце» («Янка Купала», В. Івашын). **16.** «Сава пяе песню разлукі, // Лапоча крыламі ...» («Заклятая кветка», Янка Купала). **17.** Адзінка падліку пісчай паперы. **18.** Успышка святла. **19.** Мяккая частка хлеба. **21.** Калі бацька ..., дык і дзеці ў ваду глядзяць (прык.). **25.** «Ды на Купалу на Яна // Іграе ..., іграе». З беларускай народнай песні «Ды на Купалу на Яна». **26.** «Ляці, ляці, ..., лаві, лаві, дружочак». З такімі словамі дзяўчаты на Купалле кідалі вянкі ў ваду. **31.** «Як драмалі палі, // засынаў ..., – // я спаткаўся з чароўнай дзяўчынаю» («У купальскую ноч», Паўлюк Трус). **32.** Апрацоўка паверхні для надання ёй шурпатасці.

Упоперак

1. Рака, якая ўпадае ў другую раку. **2.** Танцавальны крок. **3.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца. **4.** Пачвара ў выглядзе змея, дракона. **6.** «Ой, ..., ой, ... на Івана, // Выйшлі дзеўкі на луг, // Ой, ды сталі ў круг». З песні колавага купальскага карагода. **7.** Нота. **8.** Вязкі асадак на дне вадаёма. **9.** Упрыгожанне, аздоба. **10.** Лік, лічба. **11.** Прысвятак (21 ліпеня), з якога пачынаюцца, як лічылася, вялікія росы. **13.** «Цьмяна свеціць начнічок, // Бы купальскі ...» («Сымон-музыка», Якуб Колас). **18.** Лекавая трава, купальская зёлка. **20.** «... адшукайце // З тою чырвань-кветкай» («Папараць-кветка», А. Ржэўская). **22.** Зялёны ліст цыбулі і часнаку. **23.** «Купаленька, ... маленька, // Добры вечар добрым людзям». З купальскай песні. **24.** «Мы варажылі ўсе тайком, // Нам ... сэрца хвалявалі». («Купалле», М. Ляшчун). **27.** Вялікая сібірская рака. **28.** Вялікі майстар сваёй справы (перан.). **29.** Карабельная шлюпка. **30.** «Сёння Купала, а заўтра ..., // Ды зайграй, сонейка, зайграй нам». З купальскай песні.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



На Беларусь глядзяць усходнія суседзі

Напрыканцы чэрвеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, што ў Палацы Рэспублікі, адкрылася выстаўка «Беларусь вачыма рускіх мастакоў». Яна ладзілася па выніках пленэру расійскіх мастакоў, якія цягам некалькіх тыдняў працавалі ў Полацку, Нясвіжы, Міры, Оршы, Талачыне, Мінску і адлюстравалі на сваіх карцінах прыгажосць беларускай зямлі, харастве прыроды і нашыя гістарычныя каштоўнасці.

Праект быў арганізаваны пры ўдзеле Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга і пры падтрымцы фонду «Созидающий мир» расійскага мецэната, доктара эканамічных навук, прафесара Вячаслава Заранкова. Сам Вячаслаў Адамавіч нарадзіўся ў Беларусі, у сямнаццаць гадоў разам з бацькамі быў вымушаны з'ехаць у Санкт-Пецярбург, але не забывае пра сваю радзіму, з'яўляецца ініцыятарам шматлікіх культурных праграмаў. Менавіта дзякуючы яму і іншым беларусам Санкт-Пецярбурга, а таксама пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі ды галерэі «Універсітэт культуры» і была арганізаваная гэтая выстаўка.

У мастацкай галерэі прадстаўленыя працы жывапісцаў Яўгена Анціпава, Арсена Багдасарана, Наталлі Бекетавай, Ксеніі Заварзавай, Паўла Пічугіна, Алы Прозаравай, Івана Тарасюка і іншых. На адкрыццё выстаўкі прыехалі прадстаўнікі беларускай дыяспары, якія набылі шырокую вядомасць ды павагу за межамі і Беларусі, і Расіі. Сярод іх – выбітны кампазітар, дырэктар Творчага аб'яднання «Маэстра» Леанід Левашкевіч і намеснік старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга Аляксандр Станкевіч. Пад час свайго візіту ў Беларусь яны прадставілі ў Мінску і Маладзечне дзве канцэртныя праграмы ў межах праекта «Культурная сталіца Расіі – культурнай сталіцы Беларусі».

Праца Арсена Багдасарана

Праца Яўгена Анціпава

Адкрыццё выстаўкі стала сапраўдным святам сустрэчаў. Менавіта такія імпрэзы даюць творчым дзеячам магчымасць лепей адчуць адно аднаго, падзяліцца творчымі здабыткамі і абмяняцца ідэямі. Пад час цырымоніі адкрыцця цікавыя прапановы па развіцці і ўзмацненні міжнародных культурных сувязяў у сферы мастацтва выказалі старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, саветнік па культуры Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Маргарыта Навадворская, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Рыгор Сарока. Таксама ў імпрэзе ўдзельнічалі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок, пляменнік Казіміра Малевіча прафесар Ігар Малевіч, старшыня Беларускага фонду міру Максім Місько, першы міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пётр Краўчанка, прафесар Энгельс Дарашэвіч, дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна Анцух, прафесар Аляксандр Смолік, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Майстар» Сяргей Крыштаповіч і іншыя.

Плануецца, што выстаўка «Беларусь вачыма рускіх мастакоў» будзе прадстаўленая ў самай буйной выставачнай зале Санкт-Пецярбурга «Манеж» (яна хутка адкрыецца пасля рэканструкцыі). Хочацца спадзявацца, што працягам творчых сувязяў, усталяваных пад час выстаўкі ў Мінску, стануць цікавыя ініцыятывы, здольныя згуртаваць творчых асобаў Беларусі і Расіі ды стварыць ўмовы для збліжэння беларусаў, у якой бы краіне яны ні жылі і ні тварылі.

Павел САПОЦЬКА,
дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», выкладчык БДУКМ
Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Знайшлі папараць-кветку

9 ліпеня ў рамках рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») адбыўся конкурс на лепшы касцюм Купаліша і Купалінкі.

Удзел у конкурсе прынялі ўсе ўстановы культуры вобласці і канкурсанты з Мінска. Больш за 20 параў цудоўных Купалінак і Купалішаў прадставілі на суд гледачоў і журы свае працы. Рэгламентам конкурсу на прэзентацыю касцюмаў адводзілася ўсяго толькі паўтары хвіліны. Касцюковіцкім удзельнікам Аляксандру Селіванаву і Наталлі Бяляцкай гэтага часу аказалася дастаткова, каб годна прадставіць свае касцюмы. Цудоўны голас Аляксандра гледачы ацанілі з першых акордаў песні «Ночка купальская». Усяго праз некалькі хвілінаў абсалютнымі пераможцамі ў дзвюх намінацыях – «Лепшы мужчынскі касцюм» і «Лепшы жаночы касцюм» – былі прызнаныя касцюковіцкія ўдзельнікі.

Тым часам кіпела праца на экспазіцыі «Дрэва жыцця», дзе Касцюковіцкім раёнам была арганізаваная выстаўка «Беларускі лес». Экспанаты, прадстаўленыя Касцюковіцкім лясгасам, прыцягвалі ўвагу тысячаў гасцей свята. Ахвочыя зрабіць фота на памяць выстройваліся ў чаргу. Тут жа велізарны ажыятаж стваралі з дапамогай атрыкцыёнаў, сярод якіх бясспрэчным фаварытам з'яўляўся «Волатаўскі молат». Ад малога да вялікага спрабавалі свае сілы, спрыт і кемлівасць, прыцягваючы сваім запалам ўсё новых і новых гледачоў. Творчае афармленне пляцоўкі забяспечвалі калектывы мастацкай самадзейнасці раёна: народны ансамбль народнай песні «Калініца» і народны вакальны ансамбль «Сяброўкі» Сялецкаўскага СДК. Шмат добрых пажаданняў і словаў захаплення пачулі за два дні свята арганізатары экспазіцыі. Старанні былі цалкам апраўданыя.

Наталля ДРОБЫШАВА, намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна

Жнівень

1 – Гіргель Мікалай Сяргеевіч (1946, Мёрскі р-н), графік, прызёр міжнародных і нацыянальных выставак карыкатуры, плаката і шаржа, лаўрэат прэміі імя Кандрата Крапівы ў галіне сатыры і гумару (2006) – 70 гадоў з дня нараджэння.

2 – Казура Станіслаў Вінцэнтавіч (1881, Пастаўскі р-н – 1961), беларускі і польскі кампазітар, харавы дырыжор, педагог, збіральнік і аўтар апрацовак шэрагу беларускіх народных песень – 135 гадоў з дня нараджэння.

2 – Манцэвіч Іван Аляксандравіч (1841, Магілёўская губ. – 1863), удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. у Беларусі – 175 гадоў з дня нараджэння.

2 – Музей абароны Брэсцкай крэпасці-героя (Брэст; 1956), састаўная частка Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» – 60 гадоў з часу стварэння.

2 – Чопчыц Адам Сідаравіч (1921, Жыткавіцкі р-н – 2005), дзеяч самадзейнага мастацтва, хормайстар, педагог, аўтар падручнікаў і метадычных дапаможнікаў па музыцы і спевах, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння.

3 – Адамовіч Алесь (**Аляксандр Міхайлавіч**; 1926, Капыльскі р-н – 1994), пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат прэміі Міністэрства абароны СССР (1974), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1976), кавалер ордэна «Знак Пашаны» (1977) – 90 гадоў з дня нараджэння.

3 – Лабойка Іван Мікалаевіч (1786, Украіна – 1861), вучоны-гісторык, літаратуразнаўца, лінгвіст, які адыграў значную ролю ў пашырэнні руска-беларуска-польскіх культурных сувязяў, прапанаваў ідэю комплекснага вывучэння Беларусі і Літвы – 230 гадоў з дня нараджэння.

3 – «Сынам Айчыны, што загінулі за яе межамі» (Мінск; 1996), храм-помнік, прысвечаны беларускім воінам-інтэрнацыяналістам, якія загінулі ў Афганістане ў 1979 – 1989 гг., філіял Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – 20 гадоў з часу адкрыцця.

4 – Мазур Вікторыя Мікалаеўна (1946, Магілёў – 2015), артыстка аперэты, народная артыстка Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

4 – Радзівіл Дамінік Геранім (1786, Брэсцкае ваяв. – 1813), ваенны дзеяч – 230 гадоў з дня нараджэння.

4 – Рудніцкі Дамінік (1676, Усходняя Беларусь – 1730), беларускі і польскі пісьменнік, педагог – 340 гадоў з дня нараджэння.

5 – Аляксандр (1461, Польшча – 1506), вялікі князь ВКЛ, кароль Польшчы – 555 гадоў з дня нараджэння.

5 – Клецкая бітва (р. Лань каля г. Клецка; 1506), бітва паміж войскам ВКЛ на чале з М. Глінскім і войскам крымскіх татараў – 510 гадоў з часу першай вялікай перамогі ВКЛ над крымскімі татарамі.

5 – Маркевіч Леанід Аляксеевіч (1896, Вільня – 1980), кампазітар, дырыжор, заслужаны артыст Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння.

5 – Мішчанчук Уладзімір Андрэевіч (1946, Драгічынскі р-н), акцёр тэатра і кіно, педагог, заслужаны артыст Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2012), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2001), узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны (2011) – 70 гадоў з дня нараджэння.

6 – Дробаў Леанід Ніканоравіч (1926, Акцябрскі р-н – 2002), мастацтвазнаўца і жывапісец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996) – 90 гадоў з дня нараджэння.

6 – Локун Валянціна Іванаўна (1946, Пінскі р-н), літаратуразнаўца, крытык, даследчыца творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава і інш., лаўрэат прэміі акадэміяў навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2004) – 70 гадоў з дня нараджэння.

7 – Партной Восер Хацкелевіч (1926, Віцебск), дзеяч самадзейнага мастацтва, балетмайстар, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

8 – Асяндоўскі Антон Мартынавіч (1876, Віцебская губ. – 1945), пісьменнік, журналіст, падарожнік, вучоны – 140 гадоў з дня нараджэння.

Дзе варта пабываць

Гэтым летам Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах (Мінскі раён) прапануе сваім наведнікам пазнаёміцца з некаторымі відамі народнага мастацтва не толькі на ўласныя вочы, але і на ўласныя рукі!

Кожную суботу ў музеі праходзяць майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломапляценні і роспісе яек. Экспазіцыя музея напоўненая сапраўднымі шэдэўрамі народнага мастацтва з простых матэрыялаў, створанымі не прафесійнымі мастакамі, а звычайнымі людзьмі. Супрацоўнікі музея прапануюць гасцям паспрабаваць свае сілы ў пэўных народных рамёствах. Усе ахвочыя могуць не толькі пазнаёміцца з мастацтвам саломапляцення, роспісам яек, але і зрабіць для сябе ў якасці абярэга лялку-мотанку ці навучыцца ткаць пояс. Таму – ёсць сэнс завітаць ва ўнікальны музей.

Папярэдні запіс абавязковы па тэл.: +37529 1353241 (вэлком) або +37517 5074469 (гарадскі). Кошт удзелу ў майстар-класе на 1 чалавека – 6 руб. (60 тыс. руб.). Уваходны квіток у музей каштуе: дарослыя – 2 руб., школьнікі – 1 руб.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 27

Уздоўж: **3**. Прыгажуня. **9**. Эрас. **10**. Піва. **11**. Ураджай. **12**. Абраз. **15**. Мяшок. **18**. Слава. **19**. Алена. **20**. Альфа. **21**. Кукіш. **23**. Аверс. **28**. Здароўе. **30**. Іена. **31**. Грош. **32**. Марожанае.

Упоперак: **1**. Сэрца. **2**. Час. **4**. Раут. **5**. Арда. **6**. Найм. **7**. Лік. **8**. Карэктар. **13**. Рубель. **14**. Золата. **15**. Мускус. **16**. Шчасце. **17**. Залатнік. **22**. Кураж. **24**. Грошы. **25**. Язва. **26**. Мена. **27**. Дно. **29**. Тры.

Шаноўныя чытачы і аўтары! Наступны нумар «Краязнаўчай газеты» выйдзе 5 жніўня. Да сустрэчы, сябры!

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

П – сямнаццатая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай р («пакой»), утворанай на аснове грэка-візантыйскай устаўнай р («пі»). У старабеларускай графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школаў і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (устаў, паўустаў, скорапіс) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія памагаюць вызначыць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гукі «п», «п'» («панство», «пити»), Мела лічбавае значэнне «восемдзясят». У XVI ст., акрамя рукапіснай, набыла друкаваную форму. У сучаснай беларускай мове абазначае шумныя глухія выбухныя губна-губныя зычныя гукі «п», «п'» («палын», «песня» – «п'э-с'н'а»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму. Пры класіфікацыйным падзеле мае значэнне «шаснаццаты» (група «п»), пры лічбавай нумарацыі – дадатковае значэнне для размежавання прадметаў пад адным нумарам (шыфр № 8п).

ПААЗЕ́Р'Е, Падзві́нне – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае большую частку Віцебскай вобл. На паўднёвы ўсход па дняпроўска-дзвінскім водападзеле мяжуе з Падняпроўем, на поўдзень і паўднёвы захад па ўмоўнай лініі на поўнач ад Барысава і Лагойска праз Паставы – з Цэнтральнай Беларуссю і Панямоннем. Як гісторыка-этнаграфічны рэгіён адпавядае асноўнаму масіву старажытнай Полацкай зямлі (полацкія крывічы). Полацкая зямля ў часы Кіеўскай Русі была найбольш самастойнай правінцыяй з уласцівымі ёй вечавымі традыцыямі грамадска-палітычнага ладу і арыгінальнай культурай. Ужо ў XI ст. тут былі вядомыя каля 10 буйных для таго часу ўдзельна-валасных і эканамічных цэнтраў (Полацк, Віцебск, Друцк, Лукомль, Браслаў і інш.). Валодаючы ключавымі пазіцыямі на шляху «з варагаў у грэкі», Полацкае княства адыгрывала важную ролю ў міжнародным гандлі і культурна-эканамічных сувязях. У 2-й палове XIII – XIV ст. ва ўмовах палітычнай раздробленасці Русі, пагрозы агрэсіі з боку татара-манголаў і Лівонскага ордэна Полацкае княства ўвайшло ў склад Вялікага Княства Літоўскага, дзе захоўвала пэўную аўтаномію.

Для Паазер'я разам з часткай Падняпроўя цягам Сярэднявечча і да 2-й паловы XIX ст. захавалася этнаграфічная назва Белая Русь, якая паступова была пашыраная на ўсю сучасную тэрыторыю Беларусі. З утварэннем Рэчы Паспалітай (1569) узмацнілася экспансія каталіцтва і паланізацыя краю. Павялічыліся землеўладанні езуітаў, паўночна-ўсходняе ўзмежжа з Маскоўскай дзяржавай засялялася польскімі асаднікамі. Сюды, ратуючыся ад рэлігійных ганенняў і сацыяльнага ўціску, перасялялася частка рускіх стараверaў. У выніку Лівонскай (1558 – 1583), маскоўска-польскай (1654 – 1667), Паўночнай (1700 – 1721) войнаў мясцовая эканоміка і культура панеслі вялікія страты, адбыліся істотныя змены ў геаграфічным размяшчэнні і этнасацыяльнай структуры насельніцтва, якое скарацілася ў некалькі разоў. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 і 1793) Паазер'е было далучанае да Расіі і ўваходзіла ў склад Полацкай, з 1796 г. – Беларускай, з 1802 г. – Віцебскай губ.; заходняя частка ўваходзіла ў Віленскую губ. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і ўтварэння Беларускай ССР, усходняе Паазер'е з 1924 г. у складзе БССР; заходняя (левабярэжная) частка ўз'яднаная з БССР у 1939 г.

Традыцыйна-побытавая культура складвалася цягам многіх стагоддзяў, адлюстроўваючы як агульнабеларускія рысы, так і спецыфіку мясцовых гістарычных і экалагічных умоваў.

(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 21.07.2016
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 505.
Тыраж 636 асобнікаў.